Установа адукацыі «Белаазерскі дзяржаўны
прафесійна-тэхнічны каледж электратэхнікі»





# ІНФАРМАЦЫЙНА-ДАСЛЕДЧЫ ПРАЕКТ
# ЛОЗАПЛЯЦЕННЕ: ТРАДЫЦЫІ І СУЧАСНАСЦЬ

**Распрацавалі:**
**Пыж’янава Лілія Валянцінаўна, бібліятэкар,**
**Берднік МаксімМікалаевіч, навучэнец групы 12-С**





**Белаазерск, 2017**

**Анатацыя**

Дадзены праект - гэта адзін з аспектаў сістэмы работы па далучэнню, уключэнню навучэнцаў ў вывучэнне і развіццё народных промыслаў.

У аснове праекта – лозапляценне як адно з самых распаўсюджаных на Бярозаўшчыне рамесел.

Змест праекта арыентаваны на моладзь, навучэнцаў сістэмы ПТА і ССА і педагогаў дапаўняльнай адукацыі.

У праекце вызначаны тэма, задачы, распрацаваны маршруты і праграма рэалізацыі.

У справаздачы аб рэалізацыі праекта:

- матэрыял аб гісторыі станаўлення і развіцця лозапляцення,
- тэхналогія і прыемы пляцення з лазы,
- парады па нарыхтоўцы лазы,
- адметнасць лозапляцення на Бярозаўшчыне, яго унікальнасць,
- знаёмства з народным майстрам па лозапляценню М.Валошчыкам,
- матэрыял па афішызацыі вынікаў праекта (удзел у выставах, майстар-класах, кірмашах).

**Змест**

Інфармацыйная характарыстыка праекта……………………………….........4
Метадалагічная характарыстыка праекта……………………………………….5
Частка 1. Гісторыя развіцця лозапляцення……………………………………..8
Частка 2. Лозапляценне і яго адметнасці на Бярозаўшчыне…………………11
Частка 3.Народныя ўмельцы – бяздонная крыніца натхнення ………………17
Частка 4. Мы пляцем, вучым, дэманструем……………………………………21
Зваротная сувязь з удзельнікамі праекта…………………………………....24

# ІНФАРМАЦЫЙНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ПРАЕКТА

ТЭМА ПРАЕКТА
Лозапляценне: традыцыі і сучаснасць

Аўтары праекта:Пыж’янава Лілія Валянцінаўна , бібліятэкар; Берднік Максім Мікалаевіч, навучэнец групы 12 –С.

Удзельнікі праекта: члены гуртка “Вясёлая лозка”

Установа адукацыі “Белаазёрскі дзяржаўны прафесійна-тэхнічны каледж электратэхнікі”

Юрыдычны адрас установы: 225215 г. Белаазёрск, вул. Энергетыкаў , 8
Тэл.2 89 67, факс 2 98 38, ptu82@brest.by

Часовыя рамкі рэалізацыі праекта:2016-2017вучэбны год

**Метадалагічная характарыстыка праекта**

**Актуальнасць тэмы праекта**

**Адной з важнейшых функцый выхавання з'яўляецца адраджэнне нацыянальнай свядомасці. Без пачуцця гонару за свой народ, сваю гісторыю і культуру нельга стаць Асобай. Толькі асэнсаванне і засваенне нацыянальнай культуры адчыняе дзверы ў культуру сусветную. Любоў да Радзімы і чалавецтва не можа быць абстрактнай. Яна пачынаецца са свайго дома, двара, вуліцы, з далучэння да нацыянальнай культуры і матэрыяльнай спадчыны , якую пакінулі нам нашы продкі.**

**У наш час тэхналагічнага прагрэсу асабліва важна прыводзіць моладзь да традыцыйнай культуры. Знаеміць са страдаўнімі святамі, звычаямі, абрадамі, прыкладнымі рамествамі, бо немагчыма паўнацэннае і здаровае развіцце цывілізацыі без вывучэння вопыту продкаў кожнай канк рэтнай мясцовасці.**

**Лозапляценне – невялікая, але вельмі важная частка культурнай спадчыны і вопыту продкаў. На жаль, гэты від народных промыслаў паволі знікае. Народныя ўмельцы – людзі сталага ўзросту. Моладзь часцей аддае перавагу танным пласмасавым вырабам (вазачкі, сухарніцы і т.д.) Галоўная задача праекта – распаўсюджванне лозапляцення як віда народных промыслаў і арганізацыя вольнага часу навучэнцаў.Усе гэта і вызначае яго актуальнасць.**

**Дарэчы, пры арганізацыі вольнага часу навучэнцаў нельга не ўлічваць няпростую эканамічную сітуацыю. Для рэалізацыі праекта непатрэбна вялікіх матэрыяльных укладанняў. Лаза, востры нож, цярпенне ды фантазія – вось і усё.**

**Чаканыя вынікі.**

**У выніку рэалізацыі праекта мы**

- **Атрымаем надзею, што ўдзельнікі праекта перададуць свой вопыт сябрам і знаемым, а значыць – жыць і надалей гэтаму майстэрству.**
- **Арганізуем на новым узроўні работу гуртка.**
- **Пашырым магчымасці арганізацыі вольнага часу навучэнцаў (праз арганізацыю выстаў, даследчай дзейнасці, майстар-класаў, сустрэч з цікавымі людзьмі.**

**Мэта праекта:**

- **Сацыяльная, творчая, інтэлектуальная актывізацыя навучэнцаў шляхам далучэння да народных промыслаў.**
- **Стварэнне умоў для**
  - **выяўлення творчых здольнасцяў, набыцця новых ведаў,**
  - **выкарыстання вопыту лозапляцення пры арганізацыі вольнага часу,**
  - **атрымання пазітыўных эмоцый.**

**Задачы праекта:**

- Глыбей вывучыць гісторыю станаўлення і развіцця лозапляцення , у тым ліку на Бярозаўшчыне.
- Наладзіць сустрэчы навучэнцаў з майстрамі лозапляцення нашага рэгіёна.
- Пашырыць асартымент вырабаў з лазы у гуртку “Вясёлая лозка”.
- Наладзіць майстар-класы для жадаючых навучыцца лозапляценню.
- Арганізаваць выставу вырабаў з лазы “Ад вытокаў да сучаснасці”.

**Аб’ект даследавання:**адраджэннелозапляцення як віда народных промыслаў

**Прадмет даследавання:** развіццё творчай актыўнасці моладзі праз далучэнне да народнай прыкладной творчасці.

**Гіпотэза**

Рэканструкцыя працэсу захавання і развіцця лозапляцення будзе паспяховай, калі:

- Абаснавана (з улікам гістарычнага вопыту) неабходнасць развіцця творчай актыўнасці моладзі праз далучэнне да народна-прыкладной творчасці і даказана значнасць адраджэння народных промыслаў.
- Даказана запатрабаванасць вырабаў з лазы.

**Метады даследавання**:

- вывучэнне літаратуры,
- анкетаванне,інтэрв'юіраванне,
- назіранне,
- аналіз і сінтэз,
- прадметнае мадэляванне.

**Этапы рэалізацыі праекта**

1. Арганізацыйна - падрыхтоўчы этап:
   - Вывучэнне новага тэарэтычнага матэрыялу.
   - Пошук інфармацыі па зададзенай тэме.
   - Стварэнне творчых груп навучэнцаў.
2. Мастацка-тэхналагічны этап:
   - Вызначэнне напрамкаў пошуку, пошук інфармацыі ў розных крыніцах (па групах).
   - Складанне алгарытму праектнай дзейнасці.
   - Самастойная работа навучэнцаў па абмеркаванні задання кожнага ў групе.
   - Падрыхтоўка інфармацыі для выкарыстання ў прэзентацыях, публікацыях, рэфератах.
   - Аналіз матэрыялаў і інструментаў для выканання вырабаў.
   - Выкананне тэхналагічных аперацый.

- Кантроль і самаацэнка працы.

3. Заключны этап:
   - Абарона праекта, яго ацэнка.
   - Выстава плеценых вырабаў.
   - Удзел у конкурсах розных узроўняў.

**Асноўнае пытанне**:
Ці актуальналозапляценне на сучасным этапе?
**Праблемныя пытанні:**
- У каго можна навучыцца пляценню з лазы?
- Дзе ўзяць лазу для пляцення?
- Дзе можна рэалізаваць свае плеценыя вырабы?

-**Навучальныя пытанні:**
1. Як змянілася прызначэнне вырабаў з лазы?
2. Якія вырабы з лазы мы будзем плесці?
3. Як падрыхтаваць лазу да працы?
4. Якія сайты ў Інтэрнэце паглядзець для таго, каб больш даведацца інфармацыі пра пляценне?

Для таго, каб вызначыць актуальнасць лозапляцення на сучасным этапе, мы ўзялі інтэрв'ю ў людзей рознага ўзросту ў горадзе. Звярнуліся да іх з наступнымі пытаннямі:

- Ці падабаюцца вам вырабы з лазы?
- Якімі вырабамі з лазы вы карыстаецеся дома?
- Ці хацелі б вы навучыцца лозапляценню?

Атрымалі наступныя адказы:
70 % з апытаных на першае пытанне адказалі станоўча, 91 % карыстаюцца велікоднымі кошыкамі, 80 % карыстаюцца гаспадарчымі кошыкамі, у 5 % дома ёсць дэкаратыўныя рэчы з лазы. 50 % хацелі бы паспрабаваць навучыцца лозапляценню.

## Частка 1. Гісторыя развіцця лозапляцення

Адным з відаў народнага промыслу з'яўляецца лозапляценне. Пляценне з лазы і бяросты - старажытнае рамяство, якое ўзнікла нашмат раней ганчарнай справы і займала на працягу многіх стагоддзяў значнае месца ў жыцці людзей.Мастацтва пляцення з лазы сыходзіць сваімі каранямі ў глыбіню вякоў.Яшчэ ў каменным стагоддзі людзі ўмелі плесці вяршы і сілкі, сценкі жылля.

У эпоху неаліту, на світанку развіцця чалавецтва, пляценне з лазы з'яўлялася адным са звыклых рамёстваў. Археалагічныя раскопкі пацвярджаюць існаванне плеценых ёмістасцяў, якія служылі формамі для вырабу глінянага посуду.

У біблейскіх тэкстах сустракаюцца згадкі пра пляценне з лазы: дачка фараона знаходзіць немаўля Майсея, які плыве па Нілу у кошыку з трыснёга.

Самымі старымі са знойдзеных плеценых рэчаў з'яўляюцца егіпецкія і блізкаўсходнія знаходкі: напрыклад, у грабніцы Тутанхамона выяўлены два выдатна захаваныя плеценые  крэсла. Мэбля і хатняе начынне з лазы і каранёў дрэў на ўсю моц выкарыстоўвалася ў Старажытным Рыме - і ў дамах простых людзей, і ў дамах патрыцыяў, а ўжо яны  былі вядомымі знатакамі вытанчанасці і камфорту! З вінаграднай лазы  гладыятары арміі Спартака рабілі лёгкія і трывалыя баявыя шчыты. Але гэта толькі два-тры прыклады з гісторыі.

Тэхніка пляцення з дубцоў была адной з самых распаўсюджаных і ў Сярэднія стагоддзі. На палотнах мастакоў эпохі Адраджэння намаляваны розныя плеценыя прадметы ўжытку. На працягу многіх стагоддзяў з галін ўзводзілі жыллё і гаспадарчыя пабудовы, рабілі загарадзі, плялі дзіцячыя калыскі, кузава калёс, мэблю, кошыкі, а таксама рабілі цацкі, посуд і сувеніры.

У першай палове XIX стагоддзя пляценне з лазы, вярбы і бяросты ўвайшло ў моду сярод самых розных слаёў грамадства. Практычна ва ўсіх дамах можна было сустрэць плеценыя крэслы, сталы, канапы, шырмы, скрыні, калыскі, арэлі, прадметы сервіроўкі стала і іншыя вырабы. Плеценыя рэчы  знаходзілі шырокае прымяненне ў гаспадарцы.

Пляценне - мастацтва старажытнае, як чалавечы род. Напэўна, чалавек не можа не плесці: з найстаражытных часоў плялі ў Афрыцы і ў Азіі, у Еўропе і ў Аўстраліі, у Паўднёвай і Паўночнай Амерыцы.

Плялі з чароту і вяровак,  лазы і ратанга, бамбука і трыснёга, а цяпер да спісу магчымых матэрыялаў дадаліся сінтэтычныя стужкі. Назіраючы за тым, як дзеці важдаюцца з вянкамі, цярпліва робяць папяровыя кілімкі і  лялек з вяровак, пачынаеш падазраваць, што цікавасць да пляцення ў чалавека закладзена вельмі глыбока .

На самай справе, спіс ужыванняў лазы вельмі вялікі, а для пачатку варта расказаць пра тое, што такое  лаза і дзе яе бяруць.

**Цікава ведаць.** Лаза, падатная і трывалая адначасова, часта выкарыстоўвалася ў будаўніцтве. Яна лічылася выдатным матэрыялам для

сцен і дахаў. Важна і тое, што на пабудову адрыны з глінаплетневых сцен часу ідзе не больш за тыдзень. А другой перавагай, акрамя малых часавых выдаткаў, з'яўляецца таннасць. Разлічаны такі плецены домік, у сярэднім, на 10-15 гадоў выкарыстання, хоць, у прынцыпе, можа прастаяць дзясяткі гадоў (гэта залежыць ад умення і старання будаўнікоў). Глінабітныя падсобныя памяшканні і цяпер папулярныя на поўдні Расіі і на Украіне.

Лаза - гэта хуткарослы хмызняк з гнуткімі парасткамі. У прыродзе распаўсюджана больш за сто яе відаў, але для пляцення падыходзяць далёка не ўсё. Тут патрэбны іх аднагадовыя або двухгадовыя дубчыкі. У прыродзе зараснікі івы выявіць няцяжка: яна расце па берагах азёр і рэк. Аднак знайсці доўгія дубцы, прыдатныя для пляцення кошыкаў і мэблі, - задача не з лёгкіх. Кароткія, вузлаватыя парасткі могуць пайсці толькі на грубае пляценне агароджаў, плацін і гацяў.

Даўней крыніцай сыравіны служылі натуральныя зараснікі івы. Зараз жа яе вырошчваюць і на плантацыях, выкарыстоўваючы спецыяльна выведзеныя гатунку. Унаш час патрабаванні да лазы сталі больш жорсткімі: неабходна атрымаць пэўную гнуткасць, таўшчыню і афарбоўку дубца. І, акрамя таго, на дубцах не павінна быць адгалінаванняў і лісця. У гэтым культурныя гатунку - па-за канкурэнцыяй. Да таго ж яны значна ўраджайней дзікіх.



Як мы ўжо адзначалі, дубцы лазы павінны быць прамымі, гнуткімі, з роўнай і гладкай паверхняй. Часцей за ўсё ўжываюць для пляцення такія гатункі вярбы як краснатал, белатал.

**Цікава ведаць.**

Заўважана, што там, дзе дубцы ніхто не рэжа, кусты ператвараюцца ў дрэвы, пад якімі нават трава дрэнна расце, а галінкі пераплятаюцца і перашкаджаюць адзін аднаму, а там, дзе зразаюць дубцы - кусты становяцца толькі пышней і прыгажэй. Таму масавае захапленне пляценнем не прычыняе шкоду прыродзе. Але летняя нарыхтоўка дубцоў шкодная для вярбы, так як вярба ў гэты час расце.

## Нарыхтоўка лазовага дубца і падрыхтоўка яго да пляцення.

Нарыхтоўка лазы праводзіцца вясной, восенню і зімой. Рэжуць прут вострым нажом рухам ад сябе, захоўваючы асцярожнасць. Нарыхтаваны прут неабходна ачысціць ад кары з дапамогай шчамілкі. Вясновы прут чысціцца лёгка, а асенне-зімовы - толькі пасля варкі. Дубцы ўкладваюць у бак, заліваюць вадой, ставяць на агонь, даводзяць да кіпення і вараць на працягу 1-2 гадзін. Окараваныя дубчыкі прасушваюць і звязваюць у пучкі. Захоўваюць лазу ў сухім месцы, а перад пляценнем яе замочваюць. Пасля заканчэння працы пакінуты прут павінен быць высушаны, каб не пакрыўся цвіллю.



**Звярні ўвагу!**

Падчас рэалізацыі праекта ў нас з'явіліся свае невялікія сакрэты нарыхтоўкі лазы

- Узімку неакараваная лаза добра захоўваецца ў снезе.
- Закладваць дубцы для "варкі" лепш адразу ў кіпень. Яны тады больш светлыя і гнуткія.
- Адценне акараваным пруткам мы надаем, апускаючы іх на некалькі хвілін у вапнавы раствор, а затым прамываем іх у праточнай вадзе. Чым даўжэй мы трымаем у вапнавым растворы, тым цямнейшы пруток.

**Вывады:**

1. Рамяство лозапляцення бярэ пачатак са старажытных часоў.
2. Народнымі ўмельцамі створаны з лазы сапраўдныя шэдэўры мастацтва, якія ўпрыгожваюць залы многіх музеяў.
3. Нарыхтоўка лазы не наносіць шкоды прыродзе.





## Частка 2.Лозапляценне і яго адметнасці на Бярозаўшчыне.

На працягу сваёй шматвяковай гісторыі беларускі народ стварыў унікальную культуру. Традыцыйныя народныя святы і абрады, непаўторны фальклор, самабытныя рамёствы, нацыянальны касцюм, беларуская кухня - усю гэту багатую спадчыну беражліва захоўваюць у нашай краіне. І вядома, запрашаюць пазнаёміцца з ёй  гасцей. Якой была Беларусь сотні гадоў таму назад? Чым можа здзівіць унікальная і самабытная яе культура? Якія традыцыі беларусаў вядомыя ва ўсім свеце? Напрыклад, Столінскі раён славіцца ганчарствам, Іваноўскі і Пружанскі - бондарствам, Маларыцкі - ткацтвам і вышыўкай, і, нарэшце, **наш Бярозоўскі раён – лозапляценнем** і саломапляценнем.

У адрозненні ад вырабаў з саломы, большасць якіх выконвала ролю аграрна-абрадавай атрыбутыкі, лозапляценне засноўвалася галоўным чынам на задавальненні бытавых патрэбаў. Практычная мэтазгоднасць дыктавала развіцце тых ці іншых формаў – ад буйных (сцены пабудоў, агароджы) да дробных, часта выплеценых з ювелірнай дакладнасцю і прызначаных для утылітрана-дэкаратыўнага выкарыстання ў народным побыце. У апошнім выпадку нярэдка выкарыстоўваліся гнуткія, тонкія і доўгія карані хваевых дрэў, пляценне з якіх вядомае многім народам лясной паласы Еўропы і тэхналагічна амаль не адрозніваецца ад пляцення з лазы.

Разнастайнымі былі і спосабы пляцення: ад простага і досыць грубага ў плятнях, сценах пабудоў, вырабах гаспадарчага прызначэння – да адмысловага і тонкага ў дробных рэчах дэкаратыўна-прыкладного характару. Нярэдка ў такіх вырабах чаргавалі белую, ачышчаную ад кары (акараваную) лазу з неачышчанай (неакараванай), а таксама дубцы розных колераў, што стварала прыгожы паліхромны малюнак пляцення.

### Асноўныя віды пляцення

Рознымі былі і тэхнічныя прыемы пляцення. Існуе чатыры базавых тэхнікі: «пляценка», «вяровачка», «клетачка» і «елачка».

**«Пляценка»** - найбольш пашыранае і, відаць, самае старажытнае – **простае (крыжовае) пляценне**, калі рад раўнамерна размешчаных дубцоў паслядоўна пераплятаецца такімі ж або танчэйшымі дубчыкамі. Атрымліваецца адносна раўнамерная структура з крыжападобным малюнкам перапляцення. Калі дубцы асновы даволі тоўстыя, на плеценай паверхні ўтвараюцца своеасаблівыя рэбры, і тэхніка ўмоўна можа быць названа рабрыста-крыжавой. Большасць бытавых і ўтылітарна-дэкаратыўных вырабаў (кошыкі, палукашкі для транспартных сродкаў, рыбалоўныя прылады) плялі нашы продкі менавіта такой тэхнікай.





Калі дубцы не толькі пераплятаeasy стойкі асновы, але і перавівалі між сабою, атрымлівася пляценне **“вяровачкай”,**якое ў залежнасці ад колькасці дубцоў давала досыць разнастайныя варыянты з арыгінальным




дэкаратыўным малюнкам паверхні. Такі прыем выкарыстоўвалі не толькі для дробных рэчаў мастацкага характару, але нават і ў буйных вырабах, звязаных з архітэктурай. Так, на Палессі сваім маляўнічым выглядам вылучаліся лазовыя плятні, што агароджваюць сядзібы. Яны прыгожыя не толькі сваім арнаментальным пляценнем “касіцамі”, але і ўласцівасцю мяняць каларыстыку ў залежнасці ад асвятлення на працягу дня і нават ад пары года.

Выраб, плецены «вяровачкай», атрымліваецца вельмі трывалы.

**«Клетачка» -** найбольш зручны спосаб пляцення, па малюнку нагадвае тэкстыльныя вырабы. З-за сваёй сіметрычнай формы «клетачка» дазваляе лёгка разлічваць і фармаваць вырабы практычна любога




выгляду.



Пляценне **«ялінкай»** больш складанае і выразнае, яно дазваляе атрымліваць больш шчыльнае палатно.

Выкарыстоўваліся і розныя іншыя прыемы, тэхнікі іспосабы пляцення, якія узбагачалі малюнак паверхні, дазвалялі дабівацца спалучэння ў адным вырабе розных фактур і адпаведна – належнай дэкаратыўнасці. Асаблівай разнастайнасці яны дасягаюць у канцы 19-пач.20 ст., калі актыўны выхад гэтага рамяства на рынка вымушаў майстроў разнастаіць і ўдасканальваць прыемы пляцення. Несумненны ўплыў на работу нашых продкаў аказалі таксама розныя школы і майстэрні, дзе навучалі рамяству пляцення. Мяркуючы па літаратурных крыніцах і рэчавых матэрыялах, гэтыя



прыемы былі досыць універсальнымі на значных тэрыторыях Еўропы.

Такі ж універсалізм характэрны і для формаў вырабаў, лаканізм і круглявасць якіх дыктаваліся пругкасцю матэрыялу. Таму

гаспадарчае начынне па сваіх формах простае, ёмістае, без рэзкіх пераломаў, прычым так па ўсей Беларусі.

**Чаго толькі не плялі з лазы нашы продкі!**

Кошыкі і кузавы вазкоў і саней!





Мэблю і рыбалоўныя снасці!





Калыскі і посуд на зерне!





Падстаўкі пад вазоны, плятні, карабы на бялізну,сявенькі, карзіны і яшчэ многа чаго!

## Ад кошыкаў да лазовых карункаў

Страціўшы сваю прывабнасць у якасці матэрыялу для сельскагаспадарчых прылад, снасцей і будаўніцтва, лаза не стала менш выкарыстоўвацца.



Плецены кошык і цяпер застаўся "тарай нумар адзін" для садоўнікаў і грыбнікоў. Сапраўдны грыбнік ніколі не адправіцца на "паляванне" з паліэтыленавым пакетам, у якім далікатная грыбная здабыча памаленьку ператворыцца ў пацяруху. Бульбяныя кошыкі, трывалыя, ёмістыя, лёгкія, пацешаць дачніка пры ўборцы бульбы.

Іх форма блізкая да палавінкі шара, для большай устойлівасці знізу крыхусплошчаная. Варыянты гэтай формы надаюць кошыкам не толькі знешнюю разнастайнасць, але і некаторыя рэгіянальныя асаблівасці. У большасці выпадкаў кошык у плане авальны, выцягнуты ўздоўж дужкі. На Заходнім Палессі яго форма, наадварот, прыкметна пашыраецца ў бакі, набліжаецца да прамавугольніка, дно амаль плоскае. Лаза часцей за ўсё акараваная, у той час як у іншых рэгіёнах Беларусі звычайныя кошыкі бытавога прызначэння плятуць пераважна з неакараваных дубцоў простай крыжовай тэхнікай.

Акараваныя пруткі бываюць двух відаў: атрыманыя шляхам вываравання і зрэзаныя і акараваныя ў перыяд руху соку. Розніца ў эксплуатацыі істотная.Кошык, зроблены з выварaных пруткоў па меры эксплуатацыі пачынае набываць больш яркі глянец. Невывараныя пруткі падчас выкарыстання пачынае станавяцца шэрымі і несамавітымі. Ад таго, якая лаза для кошыкаў была выкарыстана, залежыць якасць і тэрмін службы выраба.

Дасканала адпрацаваная за стагоддзі форма кошыка, якая дыктуецца перш за усе практычнымі меркаваннямі - трываласцю, легкасцю, зручнасцю, надзейнасцю, - пакладзена ў аснову разнастайных вырабаў утылітарна-дэкаратыўнага прызначэння. Больш старанна падбіраючы дубцы, вар'іруючы іх таўшчыню і колер, прымяняючы разнастайныя прыемы пляцення, майстры стваралі розныя па формах, вельмі зграбныя кошычкі, куфэркі, каробкі для рукадзелля, збірання ягад, захавання рэчаў у дарозе.

На аснове звычайнай формы кошыка распрацоўваліся яго разнастайныя варыянты: падоўжаныя, расшыраныя, сплошчаныя, з перагародкамі, вечкамі, дзвюма ручкамі на петлях і інш. Рабрыста-крыжовая тэхніка дапаўнялася пляценнем касіцамі, дэкаратыўныя палосы якіх ажыўлялі крыху аднастайную фактуру сценак або афармлялі краі вырабаў.

Асаблівай разнастайнасцю формаў і дэкору вызначаюцца вырабы розных майстэрняў і школ, якія з канца 19 ст. адкрываюцца ў розных кутках Беларусі. Утылітарна-дэкаратыўныя вырабы з лазы з іх адмысловымі формамі, што аказаліся сугучнымі стылю “мадэрн”, набываюць шырокую папулярнасць у мяшчан. Таму многія вырабы майстэрняў, арыентаваныя у першую чаргу на гарадскога спажыўца, трацяць традыцыйную лаканічнасць і прастату формаў, набываючы некатарую манернасць і адмысловасць у духу часу. Асабліва гэта відаць па выставачных вырабах, перш за усе мэблі, у формах і дэкоры якой дзівосным чынам спалучаліся барока, ампір, мадэрн.



Дзейнасць майстэрняў і школ па лозапляценні на патрэбу спажыўца адыграла досыць супярэчлівую ролю ў развіцці промыслу. З аднаго боку, нельга не адзначыць прыкметнае ўзбагачэнне формаў традыцыйных вырабаў і прыемаў пляцення, якімі ахвотна авалодвалі народныя майстры. Гэта не магло не паўплываць на характар традыцыйнага рамяства станоўча. У той жа час, традыцыі лозапляцення прыкметна размываліся не толькі гарадскімі густамі, але і разнастайнымі дасягненнямі інтэрнацыянальнага характару, якія пашыраліся праз школы і майстэрні. Такі ўзаемаабмен, з аднаго боку, паміж горадам і вескай, здругога – паміж мясцовымі і замежнымі традыцыямі вёў да ўніверсалізацыі формаў і дэкору плеценых вырабаў.

Адзначаючы ў цэлым высокі тэхналагічны і мастацкі узровень сучаснага лозапляцення, нельга абысці ўвагай тое, што, на жаль, яно практычна страціла не толькі рэгіянальныя асаблівасці , але і нацыянальную адметнасць. Найярчэй гэта дэманструе творчасць маладых майстроў, якія вучацца рамяству па разнастайных выданнях і дапаможніках. І асабліва радуе тое, што у наш час асобныя майстры старэйшага пакалення займаюцца гэтым промыслам у сваім традыцыйным выглядзе.

## Вывады.

Падчас даследавання мы прыйшлі да высновы:

1. Народныя ўмельцы часцей стваралі рэчы з лазы для побытавага ўжытку, якія вызначаліся лаканічнасцю формаў.
2. Сучасныя вырабы маладых майстроў не маюць ярка выражаных рэгіянальных асаблівасцяў.
3. Самымі распаўсюджанымі відамі пляцення на Бярозаўшчыне былі "пляценка" (крыжовае пляценне) і "клетачка".











## Частка 3.
## Народныя ўмельцы – бяздонная крыніца натхнення

Падчас сваіх экспедыцый па Бярозаўшчыне мы пазнаёміліся з многімі майстрамі лозапляцення. Цікавай была сустрэча з ветэранам вайны і працы, народным умельцам з вескі Перасудавічы Пунько Мікалаем Аляксандравічам, які нягледзячы на свой сталы ўзрост, пляце дабротныя кошыкі для бульбы, садавіны, грыбоў не толькі для свайго ўжытку, але і для ўсіх суседзяў. А Мікіціч Павел Пятровіч з гэтай жа вёскі аднавіў старажытнае пляценне саломай. Здзівіў нас і Сірыська Ігнат Сцяпанавіч з вёскі Старыя Пескісваім майстэрствам пляцення кошыкаў з крышкай для цыбулі.

Але сапраўдным адкрыццем для нас стаў **народны майстар, паэт, педагог Мікалай Антонавіч Валошчык.**

Нездарма кажуць, што таленавіты чалавек таленавіты ва ўсім. Хіба не скажаш так пра народнага майстра Беларусі Мікалая Антонавіча Валошчыка, які жыве ў Белаазёрску?Адораны настаўнік матэматыкі, Мікалай Антонавіч не замкнуўся ў прафесіі - занадта шчодрым творчым патэнцыялам надарыла яго прырода.Мікалай Антонавіч не толькі піша вершы, успаміны, робіць пераклады, але і ужо многа гадоў займаецца пляценнем. Яго добра ведаюць не толькі ў нашым раёне, але і за яго межамі. Народны майстар неаднаразова прымаў удзел у рэспубліканскіх конкурсах дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, на "Дажынках", у святах гарадоў Бярозы і Белаазёрска, арганізоўвае і персанальныя выставы сваіх плеценых вырабаў. Яго працы



знаходзяцца ў музеях нашай краіны і ў прыватных калекцыях за мяжой.

А нарадзіўся народны ўмелец у вёсцы Ціхны Бярозаўскага раёна. У свой час скончыў Брэсцкі дзяржаўны педагагічны інстытут, потым завочна Гродзенскі педагагічны. Цяга да ведаў не давала спыняцца на месцы, і ў 1971 годзе ён паспяхова адолеў курсы нямецкай мовы пры інстытуце замежных моў у Кіеве. Як бачым, даволі неардынарны чалавек, асабліва калі ўлічыць той факт, што ў былыя гады, у адрозненне ад нашага часу, уладальнікі некалькіх дыпломаў аб вышэйшай адукацыі складалі мізэрны працэнт насельніцтва. Нягледзечы на тое, што ў школе выкладаў матэматыку, вельмі цікавіўся геаграфіяй, гісторыяй і культурай роднага краю. Дарэчы, ён яшчэ адметны і сваёй любоўю да беларускасці, да роднай мовы, на якой не толькі цудоўна размаўляе, але і даволі цікава піша.

Нашы навучэнцы падчас сустрэч задаюць яму розныя пытанні:

**– Мікалай Антонавіч, раскажыце нам, калі ласка, больш падрабязна пра свае захапленні. Хто быў Вашым непасрэдным настаўнікам і навучыў майстэрству пляцення?**

– Кошыкі з лазы пачаў рабіць яшчэ ў дзяцінстве. У мяне была такая жылка, што любіў спрабаваць усё, да чаго цягнулася душа. Назіраў некалі, як плёў саламяныя кашы дзед Тумаш у нашай вёсцы. Пасля гэтага набыў пераклад з англійскай мовы кнігі па пляценні і адтуль засвойваў асобныя прыёмы, а потым стаў прыдумляць і ўвасабляць уласныя ўзоры. Раблю з лазы сурвэткі пад вазы, шклянкі для алоўкаў, падшклянкі, настольныя і падлогавыя вазы, велікодныя і гаспадарчыя кошыкі і іншае.У канцы 60-х гадоў стварыў у Доме піянераў гурток па пляценні, дарэчы, адзіны ў Брэсцкай вобласці. Мы часта рабілі выставы, стараліся зацікавіць сваім захапленнем і іншых людзей. Не раз атрымліваў падзякі ад бацькоў за тое, што дзеці займаліся карыснай і цікавай справай.



Мікалай Антонавіч успамінае, што раней дзеці больш ахвотна вучыліся майстэрсту лозапляцення. А цяпер іх цяжэй зацікавіць, таму што гэта крапатлівая праца, якая патрабуе руплівасці і часу, ды і бацькі не надаюць належнай увагі таму, што нам, беларусам, патрэбна спрыяць захоўванню народных промыслаў, традыцый, звычаяў. Зараз людзі больш прагматычныя.

Але ж на самай справе, адзначае народны майстра, калі працуеш з натуральнымі матэрыяламі, адчуваеш прыліў сілы. І наогул, творчы працэс вельмі захоплівае чалавека, не толькі дадае жыццю стымул, але і робіць яго больш яркім, паўнаважным. Прыемна назіраць, як паступова сваімі рукамі ствараеш рэч, якая падабаецца не толькі табе, але і іншым людзям. З вялікай ахвотай бяруць такія рэчы нашы замежныя госці і тыя, хто збіраецца за мяжу, каб

прывезці менавіта нацыянальны падарунак. Што датычыцца плеценай мэблі, то ёю Мікалай Антонавіч не займаецца, таму што для гэтага няма памяшкання і належных прылад. І так цэлы пакой у кватэры забраў у сваёй гаспадыні пад майстэрню. А свае плеценыя рэчы прадстаўляе на кірмашах і выставах.

У 1998 годзе ўдзельнічаў у рэспубліканскім конкурсе “Лазовыя карункі”, дзе заняў другое месца. Праз год нашага майстра прынялі ў Саюз майстроў народнай творчасці. Праз 10 гадоў прысвоена званне народнага майстра Беларусі. У 2007 годзе ў Мінску была персанальная выстава яго вырабаў.

Акрамя лазы практыкуе пляценне з грэчкавай і аўсянай саломы. Вырабы з гэтых матэрыялаў таксама маюць сваю прывабнасць.

Мікалай Антонавіч упэўнены, штопляценне з лазы дапаможа нам палепшыць каардынацыю , умацаваць нервовую сістэму і , самае галоўнае , далучыцца да аднаго з найпрыгажэйшых відаў творчасці .

У Мікалая Антонавіча есць прадаўжальнікі яго справы. І з гонарам канстатуем, што гэтыя людзі маюць самае непасрэдныя адносіны да каледжа. Нашага выпускніка Івана Шаўчэнка называе Мікалай Антонавіч сваім вучням. Іван сур’ёзна займаецца пляценнем, прымаў удзел у выставах, праводзіць майстар-класы. Андрэй Казлюк, які працуе майстрам вытворчага навучання у Белаазёрскім каледжы, займаецца пляценнем з лазы і выстаўляе сваю творчасць на суд гледачоў, таксама вучыўся ў гуртку пад кіраўніцтвам Мікалая Антонавіча.



Мікалай Антонавіч, акрамя ўсяго, яшчэ займаецеся і літаратурнай дзейнасцю.У раеннай газеце “Маяк” друкаваў свае байкі і гумарэскі пад псеўданімам Мікола Віцязь, а ў 2011 годзе ў выдавецтве “Кнігазбор” выйшаў зборнік яго вершаў, перакладаў, успамінаў. Цікавяць яго сатырычныя і грамадзянскія тэмы, а таксама пейзажная лірыка.

Я – беларус, я гонар маю!
Сваю я мову не мяняю
Ні па-англійску, ні па-руску,
Я гавару па-беларуску.

Мікалай Антонавіч адзначае, што ў сваім жыцці кіраваўся жаданнем зрабіць нешта дзеля сваёй Радзімы, дзеля свайго краю, хацеў уславіць яго,

захаваць яго спадчыну. Гэтая любоў да Беларусі і зараз дае яму апору ў жыцці.

**Вывады.**

Адышлі ў мінулае плеценыя агароджы і гаспадарчыя пабудовы, лазовыя куфары і дарожныя саквояжы. Але дзякуючы энтузіязму і таленту майстроў, якія паспяхова працягваюць народныя традыцыі, плеценыя вырабы набываюць усё большую значнасць. Радуюць вока і класічныя кошыкі, і арыгінальныя кухонныя рэчы, і вытанчаная мэбля з лазы. Дарэчы, апошняя даволі стыльна выглядае ў **сучасных інтэр'ерах,** надае ім своеасаблівы каларыт і падкрэслівае індывідуальнасць. Гледзячы на мудрагелістасць лазовых узораў, дзіву даешся, як майстрам удаецца зрабіць такое хараство са звычайных галінак.



**Мы пераканаліся, што народныя ўмельцы – бяздонная крыніца натхнення і вопыту.**

**Мікола Валошчык "Лазовыя карункі"**

На лазе зіма штогод
Вяжа зорныя карункі.
Стаў плён клопату таго
Сэрцу гожым падарункам.

Тыя ўзоры ўжо з галін,
Што пад срэбнаю парошай
Між палаючых калін
Зноў на рэчы пераношу.

Хай парадуюць душу
Усім лазовыя карункі,
Што ўплятаюцца кашу
У ажурныя малюнкі.

## Частка 4. Фотасправаздача. "Мы пляцем, вучым, дэманструем"

Прайшоўшы маршрутамі праекта, члены гуртка "Вясёлая лозка" распрацавалі праграму сваёй дзейнасці. Яна прадугледжвае практычную рэалізацыю атрыманых ведаў і навыкаў, прэзентацыю вынікаў праекта праз арганізацыю майстар-класаў і выстаў.














**Вывады.**

Працуючы ў рамках праекта, мы даведалася, што

- Лозапляценне - гэта старадаўняе рамяство.
- Матэрыял для пляцення лёгка нарыхтаваць, і ён практычна заўсёды «пад рукой».
- Пры правільнай нарыхтоўцы дубца не наносіцца ўрон прыродзе.
- З лазы можна сплесці мноства карысных і прыгожых рэчаў і прадметаў.

Мы высветлілі, што вырабы з лазы не толькі практычныя, але прыгожыя і вытанчаныя, таму што майстар іх робіць з любоўю. Кожны выраб індывідуальны і карыстаецца шырокім попытам у насельніцтва. Такім чынам, рамяство будзе «жыць» і развівацца, так як цікавасць народа да вырабаў лозапляцення не згасае.

Сучасны дызайн прысядзібных участкаў, дач і панадворкаў амаль не абыходзіцца без прыгожых плеценых рэчаў.

Мы зразумелі, што навучыцца пляценню можа кожны, у каго хопіць цярпення, часу і жадання, вопыт назапашваецца паступова, ад працы да працы; пачынаць трэба заўсёды па прынцыпу «ад простага да складанага», ёсць майстры, якія могуць навучыць.









## Пасляслоўе

Нездарма ва ўсе часы майстры паўтаралі, што матэрыял не дурней рамесніка і часам можа сам падказаць, для чаго прызначаны.
Можа быць, у гэтым адна з загадак вечнасці ўсіх рамёстваў? І тое, што не маглі захаваць людзі, захавалі дрэва, гліна, камень, руда, тонкія, як павуціннe, валакна лёну або шоўку? Напэўна, гэта самае рэальнае чараўніцтва і ў яго варта паверыць. Найбуйнейшыя музеі свету і прыватныя калекцыі захоўваюць творы як высокага класа, так і нічым асабліва не характэрныя вырабы. Яны з дрэва і каштоўных металаў, з каменя, косці, перламутру, бяросты, скуры або фарфору. А на вуліцах і плошчах літаральна ўсё, пачынаючы ад цэглы ў старадаўніх будынках да паркавых агароджаў, рашотак і вітражоў у саборах, - усё гэта справа рук вядомых на ўвесь свет ці невядомых майстроў. І калі самыя старажытныя з прадметаў і збудаванняў захаваліся да нашых дзён, хіба гэта не грань вечнасці, у якой назаўсёды застаецца і сам майстар - натхнёны сваім рамяством чалавек?

У кожным слове, у кожнай песні, у кожным прадмеце - раствораная ў тысячагоддзях памяць народа, не пісаная, але захаваная гісторыя яго жыцця і працы.

Народнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва - вынік творчасці многіх пакаленняў майстроў. Мы пачынаем разумець, што чалавек не можа існаваць у адрыве ад прыроды ні на якім з узроўняў: ні на духоўным, ні на фізічным, ні на эмацыйным. Нашы вочы хочуць глядзець, а рукі дакранацца рэчаў, зробленых з прыродных матэрыялаў. І многія людзі пачынаюць задумвацца, перш чым купляць і ўносіць у свой дом нешта зробленае з поліэтылену, цэлулоіду, пластыка ці яшчэ якога-небудзь прадукту нафтаперапрацоўкі. Бо ў нас ёсць годная альтэрнатыва штучным матэрыялам, падказаная самой прыродай.



## Зваротная сувязь з удзельнікамі пректа



“Хачу сказаць, што пры выкананні праекта я вельмі многа даведаўся пра лазу, зразумеў, што рамяство гэта патрабуе цярпення, але і вынік працы радуе і мяне, і маіх родных. Займацца з Мікалаем Антонавічам было вельмі цікава і карысна”.*Шындыч Уладзіслаў*

“Калі я вучылася плясці з лазы, спачатку мне было шкода сваіх рук і пазногцяў. Самі разумееце, манікюр доўга не трымаўся. Але, калі ў мяне пачалі атрымліваца цудоўныя рэчы, я зразумела, што мае рукі не толькі прыгожыя, але і ўмелыя”.

*Маркечка Кацярына*





“Пасля выканання праекта, мне захацелася прадоўжыць свае заняткі пляценнем, але цяпер мяне зацікавіла салома. Плесці з лазы я трошкі ўмею, хачу паспрабаваць саломапляценне. А там паглядзім, што больш спадабаецца і спатрэбіцца ў жыцці”.*Воўк Генадзій*

“Падчас выканання праекта я стаў больш кантактаваць з бабуляй і дзядуляй. Ім было вельмі прыемна, што я цікаўлюся іх побытам і побытам сваіх продкаў. І нават калі я не стану майстрам па лозапляценні, я рады, што змог парадаваць сваіх родных, больш даведацца пра іх жыццё”.*Сікорын Аляксандр*





“Плесці з лазы я пачаў падчас вучобы ў каледжы, удзельнічаў у праекце з задавальненнем. Мае вырабы і вырабы маіх сяброў выстаўляюцца на розных мерапрыемствах і майстар-класах. Думаю, што ў далейшым я змагу выкарыстаць ў жыцці атрыманыя навыкі ”.
*Радкавец Аляксандр*

## Спіс выкарыстанай літаратуры


1. Беларускае народнае мастацтва. Альбом. – Мн., 1951. Т.1
2. Маяк. – 2015. – 15 чэрвеня.
3. Сахута Е. Народное искусство и художественные промыслы Белоруссии. – Мн., 1982
4. Сахута Я. Беларускае народнае мастацтва. Альбом. – Мн., 1980
5. Шкут Н. Белорусские художественные промыслы. Изделия из лозы и соломки. – Мн., 1985
6. Этнаграфія Беларусі. Энцыклапедыя. – Мн., 1989